Агееў А. Р. (г. Магілёў, Беларусь)

# ІЎДЗЕЙСКІЯ АБШЧЫНЫ БССР ВА ЎМОВАХ САВЕЦКАЙ РЭЧАІСНАСЦІ 1920-Х ГАДОЎ

У 1920-30-я гады яўрэі на тэрыторыі Беларусі заставаліся самай вялікай нацыянальнай меншасцю. Агульную колькасць іўдзейскіх рэлігійных абшчыны і іх дынаміку нялёгка вызначыць, паколькі існавалі зарэгістраваныя і падпольныя суполкі, не па ўсіх раёнах і акругах у архівах захавалася вартая даверу статыстыка. Ва ўмовах рэлігійнага ціску і рэпрэсій пэўная частка абшчын дзейнічала нелегальна або напалову легальна. Існавала багата так званых “нябачных” сінагог. Яшчэ цяжэй вызначыць колькасць вернікаў у абшчынах, паколькі савецкая статыстыка і справаводства ўсяляк імкнулася паказаць сістэматычнае памяншэнне іх колькасці, як адлюстраванне поспехаў антырэлігійнай палітыкі і прапаганды. Тым не менш, як паказваюць сабраныя статыстычныя дадзеныя, у сярэдзіне 1920-х гадоў назіралася пэўная стабілізацыя колькасці рэлігійных суполак, у тым ліку іўдзейскіх, а ў шэрагу выпадкаў нават іх рост. На працягу 1920-х гадоў амаль ва ўсіх гарадах і пасёлках БССР з яўрэйскім насельніцтвам існавалі іўдзейскія абшчыны.

Усяго на 1925 год па няпоўных звестках партыйных органаў на тэрыторыі БССР дзейнічала 425 сінагог і 136 рабінаў [3, Арк. 146]. Фармальна ў параўнанні з дарэвалюцыйным часам іх колькасць значна знізілася. Да 1917 года на беларускіх землях дзейнічала 704 сінагогі, у якіх працаваў 271 рабін [5, с. 195]. Параўнанне дадзеных паказвае, што ў 1925 годзе колькасць сінагог склала 60 % ад дарэвалюцыйнай, а лік рабінаў – толькі 50 %. Таму, з улікам змяншэння тэрыторыі і існавання нелегальных сінагог, можна канстатаваць, што яўрэйскія абшчыны на тэрыторыі БССР здолелі да сярэдзіны 1920 гадоў амаль аднавіць сваю дарэвалюцыйную колькасць.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Паказальнай была сітуацыя ў Барысаўскай акрузе, дзе ў першай палове 1925 года існавала 43 сінагогі, з іх восем у Барысаве. Рабінаў у акрузе было 15. Дзейнічала некалькі хедараў, у якіх, праўда, засталося, калі верыць справаздачам камітэтаў КП(б)Б, па два-тры вучні. Насельніцтва ўтрымлівала сінагогі і рабінаў за свой кошт. Праўда, у мястэчку Крайск і яўрэйскай калоніі Шамкі тутэйшыя яўрэі адмовілася выплачваць грошы на ўтрыманне рабінаў і тыя з'ехалі адтуль [20, Арк. 119]. Падобнай была сітуацыя і ў іншых акругах.

Утварэнне нацыянальных адміністрацыйных адзінак у кантэксце рэлігійнай палітыкі савецкай дзяржавы можна разглядаць, як стварэнне пэўнай альтэрнатывы традыцыйным формам нацыянальнага жыцця ў рэлігійных абшчынах нацыянальных меншасцяў. У 1929 годзе на тэрыторыі БССР дзейнічала 25 яўрэйскіх местачковых саветаў. Таксама было ўтворана і чатыры яўрэйскія сельскія саветы. Насельніцтва мястэчак налічвала 137 000 яўрэяў (31 % ад усяго яўрэйскага насельніцтва БССР) [22, Арк. 69]. Доля яўрэяў у насельніцтве беларускіх мястэчак на працягу 1920-х гадоў павольна змяншалася, але ў сярэднім складала каля паловы ўсіх жыхароў. Згодна дакументаў камуністычных і савецкіх органаў менавіта яўрэйскае насельніцтва мястэчак было найбольш рэлігійным, тут актыўна дзейнічалі іўдзейскія абшчыны.

У жніўні 1926 года ў дакладзе ЦК КП(б)Б "Аб стане яўрэйскага насельніцтва ў мястэчках БССР згодна матэрыялаў абследавання камісіі ЦК КПБ" адзначалася: "Ідэйны ўплыў духавенства, заможных і выміраючай местачковай дэмакратыі ў значнай меры падтрымліваецца тым, што ва ўмовах мястэчка рэлігійны культ лічыцца функцыямі сацыяльнай дапамогі і грамадская дапамога знаходзіцца ў значнай ступені ў руках старых філантрапічных клерыкальных таварыстваў. Дзякуючы гэтаму духавенства і заможныя прымаюць часцяком у вачах местачковай беднаты ролю "дабрадзеяў" і гэтак далей… Клерыкалізм мястэчка вельмі высокі. Рабін карыстаецца вялікім аўтарытэтам, нават сярод працоўных. Дзеці атрымоўваюць у бацькоў (па-за школаю) рэлігійнае выхаванне. Маюцца нелегальныя хедары, не лічачы "прыватных урокаў" рэлігійнага культу і старажытнаяўрэйскай мовы на даму. Згодна дадзеных Мазырскай камісіі, па ініцыятыве духавенства арганізавана клерыкальная дзіцячая група з дзяцей беднаты (псаломшчыкаў), якая супрацьпастаўлялася піянератрадам" [23, Арк. 111].

Трэба прызнаць, што ў 1920 гады яўрэйскія рэлігійныя абшчыны і філантрапічныя таварыствы, якія пры іх існавалі, праводзілі значную сацыяльную працу і аказвалі сур'ёзную дабрачынную дапамогу членам сваіх абшчын. Акрамя ведаў, у яўрэйскіх рэлігійных школах вучням выдавалі вопратку, абутак або грошы на іх набыццё, бясплатнае харчаванне, жыллё для іншагародніх навучэнцаў. Для выпускнікоў

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

існавала магчымасць пасля заканчэння працаўладкавацца рэзнікам, рабінам і гэтак далей.

Традыцыйна важнай сферай дзейнасці рэлігійных абшчын было рэгуляванне сямейна-шлюбных адносін. Але савецкае заканадаўства прызнавала рэгістрацыю шлюбаў выключна ў органах савецкай улады. Яшчэ адным важным накірункам дзейнасці абшчын было пахаванне памерлых. У дробных мястэчках БССР, дзе жыло яўрэйскае насельніцтва, функцыі пахавання выконвала іўдзейскае рэлігійнае таварыства “Хэўра кадыша”, а ў гарадах гэтым займаліся ўстановы Камгасу. Не менш важным для веруючых іўдзеяў было выкарыстанне кашэрных прадуктаў. Мясцовыя “скатабойні” часцяком здаваліся ў арэнду. Насельніцтва, якое ўжывала “кашэрнае мяса”, вымушана было набываць напалову афіцыйным шляхам, на бойні плацячы і рэзніку, і арандатару, і рабіну. Па-за бойняй забой жывёлы забараняўся.

Пры сінагогах, цэрквах і касцёлах дзейнічалі розныя арганізацыі ў галіне культуры, у тым ліку бібліятэкі. Сінагогі былі не толькі дамамі малітвы, але і своеасаблівымі клубамі. Па сінагогах БССР раз’язжалі з канцэртамі трупы “кантараў”. Значны ўплыў на яўрэйскую моладзь аказвалі так званыя вечары і канцэрты, якія арганізоўвала арганізацыя “Тыферэс Бохурым”. У сінагогах арганізоўваліся вечары з канцэртамі, на якіх выступалі заезджыя кантары, хоры, паказваліся ўрыўкі з яўрэйскіх опер (“Шуламіс”), наладжваліся танцы. Былі і казанні рэлігійнага зместу. Сінагогі былі на вечарынах перапоўнены моладдзю, нават камсамольцы “хадзілі слухаць музыку” [7, Арк. 132].

Сацыяльная база рэлігійных суполак нацыянальных меншасцяў не была выразна акрэсленай. Адназначна з яе выпалі прадстаўнікі новай палітычнай эліты – партыйныя (КП(б)Б) і ў значнай ступені савецкія служачыя. Склад рэлігійных абшчын найбольш адпавядаў традыцыйным прафесійным заняткам прадстаўнікоў нацыянальных меншасцяў. Па традыцыі большасць яўрэйскіх абшчын стваралася на прафесійнай аснове: сінагогі закройшчыкаў, муляраў, музыкантаў, цесляроў, шаўцоў і г. д. Сярод іўдзеяў пераважалі жыхары гарадоў: рабочыя, саматужнікі і гандляры. У цэлым улады адзначалі, што працоўныя ў буйных гарадах не рэлігійныя, што рэлігійныя настроі больш распаўсюджаныя ў мястэчках і вёсках. Так, у справаздачы Галоўбюро яўсекцыі пры ЦК КП(б)Б за кастрычнік – снежань 1924 года адзначалася, што рабочыя ў буйных гарадах Мінск, Віцебск не надта рэлігійныя, што рэлігійныя настроі больш уласцівы саматужнікам у мястэчках або тым, хто працаваў на прыватніка [17, Арк. 134]. Гэта пацвярджаецца і складам навучэнцаў хедараў, сярод якіх пераважалі дзеці саматужнікаў і гандляроў.

Аб рэлігійнасці яўрэяў саматужнікаў дастаткова і іншых сведчанняў. Напрыклад, летам 1924 года ў Рагачове пад час сходу таварыства саматужнікаў яўрэяў, апошнія цікавіліся ў асноўным адносінамі Савецкай



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ўлады да саматужнікаў і падаткамі. Калі ж партыйцы паспрабавалі зрабіць даклад аб рэлігіі, то яўрэі наладзілі дакладчыку "абструкцыю" [18, Арк. 34].

Нават пасля першага дзесяцігоддзя панавання Савецкай улады і правядзення шматлікіх антырэлігійных кампаній улады ў 1928 годзе адзначылі, што працоўныя яўрэі не ўваходзяць у таварыствы бязбожнікаў, яўрэйскай антырэлігійнай перыёдыкі не існуе, а ў маленькіх мястэчках вельмі шмат веруючых іўдзеяў, для якіх сінагога не толькі дом малітвы, але і своеасаблівы клуб. У 1927–28 гадах па ранейшаму былі шырока распаўсюджаны паездкі па мястэчках БССР кантараў і рэлігійных прапаведнікаў [13, Арк. 20-21].

У барацьбе за моладзь важнай традыцыйнай сферай дзейнасці іўдзейскіх абшчын была арганізацыя працы рэлігійных школ. Невыпадкова менавіта яе ўлады разглядалі своеасаблівым індыкатарам актыўнасці і ўплыву рэлігійнага духавенства сярод яўрэяў. Калі з існаваннем сінагог улады яшчэ мірыліся, то рэлігійную адукацыю імкнуліся бязлітасна выкараняць. Для закрыцця школ прымяняліся не толькі метады ідэалагічнага ціску і прапаганды, але і метады адміністрацыйнага ўздзеяння. Летам 1924 года Галоўбюро яўсекцыі пры ЦК КП(б)Б катэгарычна патлумачыла еўбюро Слуцкага павета, што "хедары і ешыботы закрываць адміністрацыйным парадкам, дамовы са школамі (малітоўнымі дамамі), якія будуць выяўленыя ў хедара ці ешыбота юрыдычна скасаваць" [9, Арк. 211].

У 1921-22 гадах вялася актыўная праца па ліквідацыі хедараў у Віцебскай губерні [14, Арк. 5]. У 1921 годзе на Віцебшчыне адзначаліся выпадкі, калі пад уплывам меламедаў бацькі не пускалі сваіх хлопчыкаў у савецкія школы [15, Арк. 37]. Улады арганізавалі некалькі паказальных працэсаў над настаўнікамі хедараў, у тым ліку ў Полацку. У выніку толькі ў Віцебску ў 1922-23 гадах было зачынена 39 яўрэйскіх школ з 1 358 вучнямі [5, с. 196].

Моцных адкрытых пратэстаў у сувязі з закрыццём рэлігійных школ намі не зафіксавана, але ўлады заўважалі рост незадаволенасці сярод яўрэяў з гэтай нагоды. У маі 1925 года еўбюро Калінінскай акругі прама адзначыла, што сярод яўрэйскага насельніцтва існавала незадавальненне савецкай уладаю з-за закрыцця хедараў [21, Арк. 21 адв.]. Асноўнай формай барацьбы, уласцівай яўрэям, былі пратэсты, якія дасылаліся ў розныя органы ўлады. Але яны не дапамагалі спыніць гвалт у дачыненне да школьнай яўрэйскай адукацыі.

Супрацьдзеянне закрыццю школ выражалася галоўным чынам у тым, што юрыдычнае скасаванне рэлігійных школ ва многіх выпадках не прыводзіла да іх фактычнай ліквідацыі. У далейшым на старонках партыйных і савецкіх дакументаў не аднойчы будуць сустракацца паведамленні аб канчатковым закрыцці хедараў і ешыботаў, але ў

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

наступных дакументах зноў і зноў будуць падымацца пытанні барацьбы з іх уплывам і неабходнасці іх ліквідацыі. Можна згадзіцца з меркаваннем, што з 1924 года яўрэйская школьная адукацыя ўступіла ў стадыю падпольнай дзейнасці [5, с. 196].

Дакументы сведчаць, што ў сярэдзіне 1920-х гадоў назіралася пэўная актывізацыя дзейнасці іўдзейскіх рэлігійных абшчын БССР. Цыркуляры, зводкі і справаздачы скупа і сцісла, але даволі часта канстатуюць павелічэнне актыўнасці рабінаў і рэлігійных школ. У канцы 1924 года бюро яўсекцыі пры Магілёўскім акружкаме КП(б)Б у горадзе Шклове адзначалася актыўнасць веруючых і высокі аўтарытэт рабіна, а таксама зафіксавала рамонт сінагогі [8, Арк. 16]. У першай палове 1925 года ў Слуцкай акрузе адчуваўся моцны ўплыў рабінаў у Леніна і Любані. Актывізаваліся меламеды, якія сталі вяртацца да сваёй прафесіі. У Старых Дарогах меламеды навучалі вялікую колькасць дзяцей [16, Арк. 102]. У 1926 годзе, як бачна са справаздачы Магілёўскай акруговай Нацкамісіі за 1925-26 гады, улады адзначалі павелічэнне ўплыву духавенства на тэрыторыі Магілёўскай акругі, дзе адбылося ажыўленне дзейнасці хедар у мястэчках Быхаў, Чавусы, Журавічы [19, Арк. 172].

З дакументаў вынікае, што ў сярэдзіне 1920-х гадоў павялічылася актыўнасць магідаў (*прапаведнікаў*). Яны наведвалі кожнае мястэчка, а ў пэўных мясцінах бывалі па 5-6 разоў на працягу адной зімы. Найбольш папулярныя прапаведнікі (напрыклад Мінскі магід) здзяйснялі цэлыя "турнэ" па мястэчках Беларусі. Сярод рэлігійных яўрэяў былі папулярныя прыезды так званых "старцаў-цудатворцаў". На іх выступленнях моладзь перапаўняла залы сінагог. Пад час прыезду яны станавіліся самымі ўплывовымі асобамі, да якіх спецыяльна прыходзілі за парадамі з адлегласці 50-60 км (Гомельская, Бабруйская, Слуцкія акругі). Пад час выступленняў адбываліся благаслаўленні, рэлігійныя танцы, якія даводзілі прысутных "да стану афекту", "підʼёны" (выкупленне грахоў за пэўную плату) і гэтак далей [7, Арк. 133].

У сярэдзіне дзесяцігоддзя ў БССР узрасла колькасць хедараў, талмуд-тор, ешыботаў. Камітэт рабінаў СССР, які з 1922 па 1930 год знаходзіўся ў Ленінградзе, рэгулярна падтрымліваў хедары чатырох беларускіх супольнасцяў, у якіх навучалася каля 500 дзяцей, і нерэгулярна яшчэ школы 20 абшчын. Сродкі браліся ад яўрэйскай дабрачыннай арганізацыі "Джойнта", заснаванай у ЗША. Ва многім гэтыя сродкі паспрыялі адраджэнню закрытых раней школ. У 1926 годзе ў Мінску больш за 270 дзяцей наведвалі "сакрэтныя" хедары. Дзейнічалі ў 1925-26 гадах і два вялікія ешыботы: у Мінску каля 200 навучэнцаў вучыліся ў "нябачных" сінагогах (у 1928 – 115), а ў Полацку навучэнцаў у ешыбоце было больш, чым у Мінскім. Дзве ўстановы з колькасцю студэнтаў каля 100 чалавек працавалі ў Віцебску. Навучальныя групы былі ў Слуцку. Ешыботы ў БССР апекаваў Лібавіцкі рабін Шнэерсон, які разам з



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

абшчынай Ленінграда аказваў фінансавую дапамогу рэлігійным вучэбным установам БССР, але ж асноўнае фінансаванне ішло ад мясцовых сродкаў абшчын. Ні ў адным горадзе Расіі ці Украіны не было такіх вялікіх ешыботаў, як у Беларусі [5, с. 196-197; 7, Арк. 132].

Напачатку яўрэйскія рэлігійныя абшчыны былі саюзам прыхаджан той ці іншай сінагогі, а ў сярэдзіне 1920-х гадоў узніклі думкі аб неабходнасці стварэння гарадскіх рэлігійных абшчын. Упершыню ў СССР такі прэцэдэнт быў рэалізаваны ў Ленінградзе, дзе ўтварыўся саюз прыхаджан сінагог горада (“ЛЕРО”). У Мінску ў 1926 годзе падобны саюз узначальваў старшыня рэлігійнай абшчыны рабін Глускі (*Глусский*). Саюз займаўся не толькі рэлігійнымі, але і грамадска-палітычнымі, сацыяльна-эканамічнымі пытаннямі. На адным з пасяджэнняў Мінскай абшчыны абмяркоўвалася пытанне землеўпарадкавання яўрэяў і адносіны да гэтага абшчыны. Была звернута ўвага на тое, што саматужнікі і земляробы яўрэйскай нацыянальнасці “не могуць карыстацца тымі дабротамі, што дае савецкая ўлада” ў сувязі з суботнім адпачынкам. Атрымоўваецца, што ў яўрэйскіх савецкіх калектывах няма нічога “яўрэйскага” [7, Арк. 128-129].

Аналіз дакументаў выявіў у сярэдзіне 1920-х гадоў незвычайную, па сваёй сутнасці анамальную для савецкай атэістычнай рэчаіснасці, тэндэнцыю пэўнай актывізацыі рэлігійнага жыцця нацыянальных меншасцяў, у тым ліку яўрэяў. Таксама назіраецца карэляцыя паміж актыўнай фазай правядзення палітыкі беларусізацыі і актывізацыяй рэлігійнага і нацыянальнага жыцця этнічных меншасцяў. Далучэнне ўсходніх рэгіёнаў Беларусі да БССР і поспехі беларусізацыі спрыялі актывізацыі дзейнасці прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцяў. Так, ідэі “яўрэізацыі” насельніцтва актыўна праводзіў у жыццё дасланы з Мінску інспектар еўкультуры Магілёўскага аддзела народнай адукацыі, член КП(б)Б Барыс Саламонавіч Окунь [4, с. 267]. А пасля пачатку рэальнага згортвання беларусізацыі ў канцы 1920 – пачатку 1930 гадоў назіралася зніжэнне актыўнасці прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцяў у грамадска-палітычнай і культурнай сферах. У галіне рэлігійнай дзейнасці намі выяўлена падобная ўзаемазалежнасць і пэўная актывізацыя рэлігійнага жыцця ў яўрэйскім асяроддзі ў сярэдзіне дзесяцігоддзя.

Улады не глядзелі спакойна на актыўнасць рэлігійных нацыянальных абшчын, ціск на іх узмацніўся. З канца дзесяцігоддзя колькасць абшчын практычна ўсіх нацыянальных меншасцяў пачынае змяншацца, што звязана са ўзмацненнем работы органаў савецкай улады па выкараненню рэлігійных вераванняў і ўяўленняў, у тым ліку са ўзмацненнем антырэлігійнай прапаганды. Урады РСФСР і БССР прынялі заканадаўчыя акты, скіраваныя на звужэнне сацыяльнай ролі абшчын, на адміністрацыйнае і агітацыйнае прыцясненне лідараў абшчын, перапыненне іх кантактаў унутры рэспублікі, а таксама з замежжам [6, с. 24].

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Антырэлігійныя кампаніі праходзілі дастаткова актыўна на працягу ўсяго дзесяцігоддзя. Паказальныя “палітсуды” над рэлігійнымі абшчынамі і іх школамі сталі масавай з’явай. У сярэдзіне 1920-х гадоў у Калінінскай акрузе адбылося шэсць судоў над хедарамі на яўрэйскай мове: два ў Клімавічах, па аднаму ў Расна, Касцюковічах, Хоцімску і Мсціславе. Аднак, як толькі рабін Манусаў з Нова-Быхава наведаў восем населеных пунктаў, рэлігійнасць насельніцтва адразу актывізавалася [21, Арк. 18 адв.]. У першай палове 1925 года ў Слуцкай акрузе прайшоў суд на яўрэйскай мове над “Рош-Ешыве” [16, Арк.102]. Тады ж у Барысаўскай акрузе адбыўся суд над меламедамі [20, Арк. 119]. Шырокі розгалас у Мінску, Барысаве, Бабруйску і іншых месцах рассялення яўрэяў меў судовы працэс над рэзнікамі ў Мінску [10, Арк. 137].

Перыядычна ініцыявала і праводзіла ў 1925 годзе антырэлігійныя кампаніі Галоўбюро яўсекцыі пры ЦК КП(б)Б. Прымяняліся, кажучы сучаснай мовай, крэатыўныя спосабы ўздзеяння на масы. Так, падчас восеньскіх яўрэйскіх святаў 1925 года ў мястэчкі для выступлення на антырэлігійныя тэмы перад працоўнымі яўрэямі быў камандзіраваны былы яўрэйскі рабін Манес з мястэчка Нова-Быхаў Магілёўскай акругі [12, Арк. 77]. Грамадзяніна Манеса, якому на той час было 57 гадоў, яшчэ 10 сакавіка 1925 года Галоўбюро яўсекцыі пры ЦК КП(б)Б накіравала ў распараджэнне Народнага Камісарыята Асветы. Да новай службы ён 25 год быў рабінам, апошні час у мястэчку Новы Быхаў Магілёўскай акругі, але выракся ад свайго сану і ўяўляў відавочны інтарэс для ўладаў пры правядзенні антырэлігійных акцый [12, Арк. 138].

Не менш значную ролю для адмоўнай дынамікі колькасці рэлігійных абшчын у канцы дзесяцігоддзя ігралі мерапрыемствы па паслабленню матэрыяльнай базы рэлігійных абшчын. На працягу ўсяго дзесяцігоддзя назіраліся сістэматычныя спробы перадачы культавых збудаванняў у рукі органаў улады або гаспадарчых суб'ектаў для размяшчэння ўстаноў культуры або выкарыстання ў гаспадарчых патрэбах. Нягледзячы на асобныя выпадкі адабрання сінагог у першай палове 1920-х гадоў, масавай перадачы культавых будынкаў яшчэ не назіралася. Але ўлады імкнуліся абмежаваць у сінагогах рамонтныя работы, каб пазней лягчэй было шукаць падставы для перадачы занядбалых будынкаў у рукі працоўных. Тым не менш, у сярэдзіне 1920-х гадоў зафіксаваны выпадкі адкрыцця новых сінагог. У Барысаўскай акрузе ў першай палове 1925 года з агульнай колькасці (43 сінагогі) дзве ў Нова-Барысаве і Плешчаніцах былі новапабудаванымі [20, Арк. 119].

Рэзка ўзмацнілася практыка канфіскацыі культавай уласнасці ў канцы 1920 - пачатку 1930 гадоў. Так, вясной 1929 года ў Магілёўскай акрузе прайшла “хваля дзеянняў мясцовых партыйных уладаў па закрыцці храмаў”, што выклікала масавае абурэнне і процідзеянне з боку вернікаў. Аказваўся моцны ціск і на членаў сямей святароў і настаўнікаў рэлігійных



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

школ. Так, дзявятага студзеня 1930 года з Магілёўскага медыцынскага тэхнікума выключылі з трэцяга курса студэнта Зуніна, які паспяхова вучыўся, але аказаўся сынам "меламеда" [11, Арк. 295].

Даследаванне стану існавання іўдзейскіх абшчын у 1920-я гады паказала, што сацыяльная база рэлігійных суполак у цэлым адпавядала традыцыйным заняткам прадстаўнікоў нацыянальных меншасцяў: сярод іўдзеяў пераважалі жыхары гарадоў і мястэчак: рабочыя, саматужнікаў і гандляры. З дакуметаў вынікае, што працоўныя ў буйных гарадах былі менш рэлігійныя, а рэлігійныя настроі больш распаўсюджаны ў мястэчках і вёсках, рэзкай переваги сярод прыхаджан людзей старэйшага ўзросту над моладдзю не назіралася. Намі зафіксавана, што нягледзячы на сістэматычныя спробы захопу культавых збудаванняў савецкімі актывістамі і органамі ўлады, у сярэдзіне 1920-х гадоў адзначаліся выпадкі адкрыцця новых сінагог, спробы вяртання ўласнасці абшчын. Рэлігійныя нацыянальныя суполкі і яўрэйскія філантрапічныя таварыствы ў 1920-я гады актыўна праводзілі сацыяльную працу – аказвалі дабрачынную дапамогу членам сваіх абшчын.

Выяўлена залежнасць паміж асаблівасцямі правядзення палітыкі беларусізацыі і рэлігійнага жыцця нацыянальных меншасцяў. Аналіз дакументаў дазваляе выказаць меркаванне, што адным з фактараў, які спрыяў у сярэдзіне 1920-х гадоў актывізацыі рэлігійнага жыцця нацыянальных меншасцяў, была палітыка беларусізацыі, якая не толькі актывізавала дзейнасць тытульнага этнасу, але і стымулявала нацыянальную і рэлігійную актыўнасць этнічных груп. Адначасова са згортваннем палітыкі беларусізацыі ў канцы 1920-х гадоў назіралася пагаршэнне становішча рэлігійных нацыянальных абшчын.

Актывізацыя рэлігійнага жыцця нацыянальных меншасцяў у сярэдзіне дзесяцігоддзя стала магчымай не толькі дзякуючы прыстасаванню да ўмоў савецкай рэчаіснасці рэлігійных абшчын, але і з прычыны агульнага "пацяплення" грамадска-палітычнай сітуацыі ў краіне. Характэрна, што вывучаючы выбарчыя кампаніі ў мясцовыя Саветы БССР у 1920-я гады, да падобных высноў аб большых магчымасцях насельніцтва ў сярэдзіне дзесяцігоддзя прыйшоў даследчык Сяргей Елізараў [2, с. 46].

Актывізацыя дзейнасці рэлігійных абшчын назіралася не толькі ў нацыянальных меншасцях, але і ў праваслаўнай большасці. Менавіта ў сярэдзіне 1920-х гадоў, пасля правядзення ў Магілёве 17-19 мая 1924 года Беларускага абласнога царкоўнага сабору, "абнаўленцы" атрымалі "легальную" царкоўную структуру як у царкоўным, так і ў грамадзянскім плане. У выніку Беларускі праваслаўны свяшчэнны сінод стаў легальнай царкоўнай арганізацыяй на тэрыторыі БССР [1, с. 44]. Падобны рост рэлігійнай актыўнасці на працягу 1920-х гадоў адзначаўся доктарам Навіцкім і ў дзейнасці евангельскіх аб'яднанняў [5, с. 194-195].

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У цэлым падводзячы вынік, можна зрабіць выснову, што яўрэйскім рэлігійным суполкам у 1920-я гады ўдалося прыстасавацца да ўмоў савецкай рэчаіснасці і навучыцца выжываць у неспрыяльных абставінах. У сярэдзіне дзесяцігоддзя назіралася пэўная актывізацыя рэлігійнага жыцця нацыянальных меншасцяў, а рэзкае пагаршэнне становішча рэлігійных абшчын адбылося ў канцы 1920-х гадоў. Нягледзячы на палітычны і сацыяльны ціск з боку органаў савецкай улады, яўрэйскія рэлігійныя абшчыны, якія захаваліся ў 1920-я гады, прыстасаваліся да новых неспрыяльных савецкіх умоў існавання і знаходзілі магчымасці для функцыянавання. Гэтаму спрыяла традыцыйна важная роля рэлігійных суполак у захаванні нацыянальнай ідэнтычнасці этнічных груп, што можа быць у найбольшай ступені было ўласціва яўрэям на працягу іх шматвяковай няпростай гісторыі.

Спіс выкарыстаных крыніц


1. Бараненка, Віктар Беларускі абласны царкоўны сабор 1924 г. у Магілёве: перадумовы, падрыхтоўка, правядзенне / Віктар Бараненка // Беларускі гістарычны часопіс. – 2015. – № 9. – С. 37-45.
2. Елізараў, Сяргей Пад сцягам "абвастрэння класавай барацьбы": выбарчыя кампаніі ў мясцовыя Саветы БССР у 1920-я гады / Сяргей Елізараў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2015. – № 11. – С. 39-46.
3. Інфармацыя "Работа КПБ сярод яўрэйскіх працоўных мас і чарговыя задачы" // ДАГАМаг. – Ф. 6577. – Воп. 1. – Спр. 105.
4. История Могилевского еврейства: Документы и люди: Научно-популяр. очерки и жизнеописания : в 2-х кн. – Кн. 2. – Часть 1 / сост. А. Литин. – Мн. : Юнипак, 2006. – 388 с.
5. Канфесіі на Беларусі (к. XVIII–XX ст.) / В. В. Грыгор'ева, У. М. Завальнюк, У. І. Навіцкі, А. М. Філатава : Навук. рэд. У. І. Навіцкі. Мінск : ВП „Экаперспектыва", 1998. – 340 с.
6. Карпекін, К. Р. Іўдзейскія абшчыны ў БССР (студзень 1919 – верасень 1939 г.) : дыс. ... канд. гіст. навук : 07.00.02 / ІГ НАНБ / К. Р. Карпекін. – Мінск, 2013. – 24 с.
7. Матэрыялы і высновы аб яўрэйскім клерыкалізме // ДАГАМаг. – Ф. 6577. – Вопіс 1. – Спр. 271.
8. Пр. № 4 пасяджэння бюро яўсекцыі пры Магілёўскім акружкоме КП(б)Б ад 13.12.24 года // ДАГАМаг. – Ф. 6577. – Воп.1.– Спр. 107.
9. Пр. № 11 Галоўбюро яўсекцыі пры ЦК КП(б)Б ад 14.06.24 года // ДАГАМаг. – Ф. 6577. – Воп.1. – Спр. 105.
10. Пратакол № 26 пасяджэнне Галоўбюро яўсекцыі пры ЦК КП(б)Б ад 10.03.1925 года // ДАГАМаг. – Ф. 6577. – Воп. 1.– Спр. 105.
11. Пратакол № 3 ад 09.01.1930 года пасяджэння калегіі НКА БССР // ДАГАМаг. – Ф. 6577. – Воп. 1. – Спр.845.
12. Пратакол № 37 Галоўбюро яўсекцыі пры ЦК КП(б)Б ад 15.08.25 г. // ДАГАМаг. – Ф. 6577. – Воп. 1. – Спр. 105.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

13. Рэзалюцыя па дакладу аб масавай працы // НАРБ. – Ф. 4п. – Воп. 1. – Спр. 4251.
14. Справаздача аб дзейнасці Віттубаддзела па справах нацыянальнасцей з 01.05.1921 года да 25.03.1922год // ДАВц. – Ф. 56. – Воп. 1. – Спр. 185.
15. Справаздача аб дзейнасці Віттубаддзела па справах нацыянальнасцей з 01.05.1921 года да 25.03.1922 год // ДАВц. – Фон. 56. – Воп. 6. – Спр. 54.
16. Справаздача аб працы яўбюро Слуцкага акружкома за снежань 1924 года // ДАГАМаг. – Ф. 6577. – Воп. 1. – Спр. 105.
17. Справаздача Галоўбюро яўсекцыі пры ЦК КП(б)Б за кастрычнік-снежань 1924 года // ДАГАМаг. – Ф. 6577. – Воп. 1.– Спр. 105.
18. Справаздача галоўбюро яўсекцыі ЦК КП(б)Б // НАРБ. – Фон. 4п. – Воп. 1. – Спр. 1869.
19. Справаздача Магілёўскай акругавай Нацкамісіі за 1925 –1926 гады. // ДАГАМаг. – Ф. 6577. – Воп. 1. – Спр. 442.
20. Справаздача яўбюро Барысаўскага акружкома КП(б)Б з 20.11.1924 года па 20.11.1925 года // ДАГАМаг. – Ф. 6577.– Воп. 1. – Спр. 105.
21. Справаздача яўбюро Калінінскага АК КП(б)Б // ДАГАМаг. – Фон. 6601. – Воп. 1. – Спр. 291.
22. Справаздача яўбюро ЦК КП(б)Б за 1926 год // ДАГАМаг. – Ф. 6577. – Воп. 1. – Спр. 271.
23. Тэзісы даклада ЦК КПБ. 1926 год // ДАГАМаг. – Фон. 6577. – Воп. 1. – Спр. 271.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова